З архіваў часу

Аляксандр ВАБІШЧЭВІЧ

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЕ ЖЫЦЦЁ Ў ВІЛЕНСКІМ КРАІ. ПАЧАТАК 1920-х гг.

Нацыянальнае адраджэнне, ля вытокаў якога на пачатку XX ст. стаялі браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Аляксандр Уласаў, Янка Купала і іншыя, разгортвалася ў Вільні. Роля агульнанацыянальнага беларускага цэнтра паступова пераходзіла да Мінска, але Вільня да Першай сусветнай вайны ўпэўнена "давала тон усяму руху, выдавецтву і літаратуры"[1].

Традыцыі нацыянальна-культурнага адраджэння працягваліся ў Вільні і ў час нямецкай акупацыі 1915 – 1918 гг. Там 13 лістапада 1915 г. адкрылася першая беларуская пачатковая школа. У пачатку 1916 г. пасля дырэктывы і інструкцыі нямецкіх акупацыйных улад адносна арганізацыі адукацыі стварэнне беларускіх школ паскорылася. Да канца 1918 г. у заходнебеларускім рэгіёне дзейнічала (па розных крыніцах) ад 153 да 350 беларускіх школ. Даволі актыўным было асветнае жыццё ў самой Вільні: дзейнічалі некалькі беларускіх пачатковых школ, настаўніцкія курсы, выдавалася газета "Гоман", разгарнула сваю працу Беларускае навуковае таварыства.

Пасля адыходу нямецкіх войскаў у канцы 1918 г. ваенна-палітычная сітуацыя на Віленшчыне была няўстойлівай. Імкліва змяніліся ўлады. Ваеннае ліхалецце моцна пагоршыла матэрыяльнае становішча насельніцтва. Нягледзячы на ўсё гэта, намаганнямі дзеячаў Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны 1 лютага 1919 г. распачаліся заняткі ў Віленскай беларускай гімназіі.

Няпросты быў час для асветнай дзейнасці. З прычыны прыватнага характару гімназіі яе першы дырэктар Міхаіл Какановіч мусіў пастаянна клапаціцца і пра матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, пра штодзённае жыццё настаўнікаў і вучняў.

Пэўнае ажыўленне культурна-асветнай дзейнасці ў той час назіралася і на тэрыторыі былой Гродзенскай губерні, а таксама паўднёвай часткі Віленскай – Лідскага, Ашмянскага і Віленскага паветаў. Гэтыя землі былі ў 1918 – 1923 гг. пад юрысдыкцыяй Міністэрства беларускіх спраў у літоўскім урадзе. Планавалася нават прызначыць Максіма Гарэцкага на пасаду інспектара ўсіх беларускіх школ, але пасля таго, як па літоўска-савецкай мірнай дамове (12 ліпеня 1920 г.) Вільня разам з суседнімі землямі (у тым ліку Гродзеншчынай) прызналася неад'емнай часткай Літвы, беларуская справа пайшла на спад.

Віленскі край ізноў стаў разменнай манетай у гульнях вялікай палітыкі. У кастрычніку 1920 г. па сакрэтным загадзе Юзафа Пілсудскага Першая літоўска-беларуская дывізія генерала Люцыяна Жалігоўскага ўзняла "бунт" супраць перадачы Віленшчыны Літве. На тэрыторыі Віленскага, Свянцянскага, Трокскага, Лідскага, Ашмянскага, Браслаўскага паветаў утварылася дзяржава-марыянетка – Сярэдняя Літва. Паводле некаторых даследчыкаў, Юзаф Пілсудскі разглядаў стварэнне Сярэдняй Літвы як крок да больш шырокай польска-беларуска-літоўскай федэратыўнай дзяржаўнасці[2]. Уладам Сярэдняй Літвы трэба было заручыцца падтрымкай беларусаў напярэдадні плебісцыту аб дзяржаўнай прыналежнасці згаданых тэрыторый. Таму яны шчодра абяцалі клапаціцца пра беларускую культуру.

Сярод віленскіх беларусаў былі як прыхільнікі, так і праціўнікі Люцыяна Жалігоўскага. Каб скаардынаваць сумесныя дзеянні, на нарадзе беларускіх дзеячаў 9 кастрычніка 1920 г. (з удзелам Максіма Гарэцкага, Вацлава Іваноўскага, Антона Луцкевіча, Адама Станкевіча, Браніслава Тарашкевіча і іншых) было вырашана выкарыстаць спрыяльныя палітычныя абставіны для культурна-асветнай працы. Па прапанове ўрада Сярэдняй Літвы з 15 лістапада 1920 г. Браніслаў Тарашкевіч узначаліў беларускую секцыю ў Дэпартаменце асветы. Разам з ім працавалі рэферэнт – Янка Станкевіч, старшы канцылярыст – Сымон Вялікдзень-Жалудовіч, малодшы канцылярыст – Платон Латышонак[3]. Беларуская секцыя разгарнула вялікую актыўнасць. Ужо ў студзені 1921 г. дзейнічала 121 беларуская пачатковая школа[4]. А да пачатку 1922 г. іх налічвалася ўжо 178, з іх 7 – у Вільні. Дзейнічалі таксама беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах, беларускія гімназіі ў Вільні і Радашковічах.

Рабіліся захады і па стварэнні асобнага грамадскага аб'яднання па пытаннях асветы. На пасяджэнні Беларускай цэнтральнай школьнай рады (22 лютага 1921 г.) была прынята пастанова аб стварэнні Таварыства беларускай школы. Статут ТБШ быў зацверджаны Дэпартаментам унутраных спраў Сярэдняй Літвы 1 ліпеня 1921 г. Галоўная мэта Таварыства беларускай школы – "культурна-асветная дапамога беларускаму народу ў развіцці яго школьнай адукацыі, выхаванні і навучанні на родным беларускім языку"[5].

Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч *— гісторык. Кандыдат гістарычных навук (1996), дацэнт. Закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1990). Загадчык кафедры гісторыі культуры і рэлігіі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна. Працаваў настаўнікам гісторыі ў СШ № 23 г. Брэста. Даследуе праблемы нацыянальна-культурнага развіцця Заходняй Беларусі ў 1920 — 1930-я гг., пытанні гісторыі культуры Беларусі ў XX ст., краязнаўства. Выдаў манаграфію "Асвета ў Заходняй Беларусі (1921 — 1939 гг.)" (2004), суаўтар кніг "Сыны і пасынкі Беларусі" (1996), "Назаўсёды разам" (1999), "Брэсцкі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя А. С. Пушкіна: Старонкі гісторыі" (2005 г.), мае больш як 140 навуковых, навукова-папулярных і навучальна-метадычных публікацый.*